Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Пераменa адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 43 Вільня, Серада 31-га жніўня 1927 г. Год I

Двухстароньні абавязак.

Ня гледзячы на тое, што найбольш жывыя і працаздольныя элемэнты ў нашых самаўрадах выразна адсоўваюцца ад творчае гаспадарчае і культурнае працы панамі старостамі, — усе тыя беларусы, якія папалі ў гмінныя і мястовыя рады, а тым балей у павятовыя соймікі, павінны шчыра ўзяцца за работу ў тых межах, якія дае ім іхняе становішча.

Перадусім нашы выбранцы, як запраўдныя сыны працоўнага народу, лепш, чым хто іншы, ведаюць ягоныя патрэбы й балячкі. Яны на ўласнай скуры пазналі гэтыя балячкі і крыўды, якія на кожным кроку сустракае працоўны люд. Дык першая задача самаўрадавых працаўнікоў—гэта ўзяць на сябе ініцыятыву (пачын) у выяўляньні іх і вясьці сыстэматычную ўпорлівую працу дзеля іх зьніштажэньня. Нашы выбранцы павінны далей вясьці барацьбу за пераклад непасільных для працоўнага сялянства падаткавых і натуральных цяжараў і павіннасьцяў з працоўных масаў — на абшарнікаў. Урэшце, як сыны *беларускага* працоўнага народу, яны павінны шчыра, энэргічна заняцца справай беларускае культурна-асьветнае працы, дамагаючыся школы ў роднай мове, ладзячы беларускія школы на кошт самаўрадаў, пільнуючы, каб у ўтрымліваных самаўрадамі (соймікамі) агульна-асьветных і спэцыяльных (агранамічных) школах вучылі беларускую моладзь ня ў чужой польскай, а ў роднай беларускай мове, каб гэтыя рассаднікі культуры перасталі служыць паслухмянай прыладай дзеля апалячваньня беларусаў. Гмінныя рады, дзе ў вялізарнай большасьці выпадкаў пераважаюць беларусы, павінны адчыняць у сваіх гмінах беларускія бібліатэкі-чытальні і народныя дамы, ладзіць беларускія вячорныя школы дзеля сталых няпісьменных грамадзян, рабіць асыгноўкі з грамадзкіх сум на беларускую культурную працу, як дагэтуль рабілі панаваўшыя ў нашых самаўрадах палякі, не шкадуючы мужыцкага мазаля на розныя польскія ўстановы, што вядуць барацьбу з беларушчынай.

Але гэта йшчэ ня ўсё: мала *дабівацца* нечага,—трэба й *дабіцца* свайго. А дзеля гэтага ізноў-жа неабходна, каб нашы радныя і сябры соймікаў мелі крэпкую апору і падтрыманьне ў масе. Наладжаньне такое сувязі з сваімі выбаршчыкамі, сталае інфармаваньне вёскі аб тым, што робіцца ў самаўрадавых установах, выслухіваньне пажаданьняў вёскі, скліканьне сялян на нараду ў-ва ўсіх справах, якія зачапляюць іхнія патрэбы і інтарэсы,—вось той варунак, пры катораым радныя ня будуць сябе пачуваць адзінокімі, адарванымі ад народнае масы. Дый сіла й павага радных пры падтрыманьні іх выбаршчыкамі ад гэтага толькі ўзрасьце.

Ускладаючы ўсе гэтыя абавязкі на нашых *выбарных*, трэба адначасна адзначыць, што падобныя-ж абавязкі ляжаць і на *выбаршчыках*. Бо-х мала падаць свой голас на выбарах і пасьля спакойна заснуць, думаючы: хай нашы радныя самі спраўляюцца! Такая думка—крыніца ўсіх нашых грамадзкіх бед і няўдачаў: бо ні паслы ў Сойме, ні радныя ў гмінных ды павятовых самаўрадах самі па сабе не прадстаўляюць сілы, а *сілу ім дае падтрыманьне масы*, сілу іх творыць сьвядомасьць—як іхняя, так і іхніх ворагаў, з якімі прыходзіцца ўсьцяж вясьці ўпорлівую барацьбу, — што *за плячыма пасла ці раднага стаіць вялікая грамада народу*, якая заўсёды падтрымае яго ў патрэбе.

Удатныя вынікі нашае працы ў самаўрадах і будуць залежаць ад двух варункаў: ад здольнасьцяў і цьвёрдасьці нашых выбранцаў, ды ад таго, ці між імі і масай народнай завяжацца крэпкая сувязь, ці маса іх падтрымае.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Дамагайцеся сваей роднай беларускай школы, бо яна ёсьць мілейшая і бліжэйшая да душы Вашых дзетак.

Навука ў роднай беларускай мове больш зразумелая для Вашых дзетак, як ў іншых мовах!

Кожны народ мае сваю родную школу, дык і нашыя беларускія дзеткі маюць на яе права, якога ніхто ня можа ад іх адабраць.

Складайце Школьнаму Інспэктару як можна больш дэклярацыяў, каб для вашых дзетак адчынілі ўрадовую беларускую школу, або ператварылі істнуючую польскую на беларускую.

Ня гледзячы на тое, што ўрад ня даў Вам беларускае школы на дэклярацыі, зложаныя Вамі ў мінулыя гады падавайце нанова дэклярацыі ды яшчэ ў большым ліку.

Калі на Вашы дамаганьні ўрад адчыніў двухязыную, гэта значыць польска-беларускую школу, дык усёроўна складайце дэклярацыі, каб адчынілі чыстую белар. школу.

Ня бойцеся запугваньняў няеумленных людзей, якія рознымі спосабамі будуць нагаварваць, каб Вы не падавалі дэклярацыяў на беларускую школу.

Падавайце ў Галоўную Управу Т-ва Беларускае Школы ў Вільні—сьв. Ганны № 2—імёны і прозьвішчы тых, хто будзе Вас адгаварваць, або запугваць.

Аб усякіх надужыцьцях, ці то збоку паліцыі, ці адміністрацыі, ці гміны,ці прыватных асобаў безадкладна падавайце ў Галоўную Управу, каб пацягнуць іх да судовае адказнасьці за пагвалчаньне Вашых правоў, закону ад 31./VII. 1924 г. і распараджэньня Міністра Асьветы ад 7./I. 1925 г.

Дэклярацыі і інструкцыі выпісвайце з Галоўнае Управы Т-ва Беларускае Школы — Вільня, вул. Сьв. Ганны № 2.

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы.

Інструкцыя, як дамагацца ўрадавае беларускае школы, будзе зьмешчана ў чародным нумары газэты.

Водгукі забойства Сакко й Ванцэтті.

Пахароны.

Хутка пасьля таго, як пачаліся агледзіны трупаў, пачаліся ў Бастоне сутычкі з паліцыяй. Як паведамляюць газэты, парадак ізноў вернены. Масы народу праходзілі каля труны Сакко і Ванцэтті. Спроба камітэту абароны наняць вялікшую салю не ўдалася. Улада кіўнула ўласьнікам, каб не аддавалі саляў. Каб не дапусьціць да выкарыстаньня дзеля гэтай мэты саляў камітэту абароны, уласьнік паставіў чым хутчэй бэлькі ў уваходзе, так што немагчыма было ўнесьці труны. Выстава цел адбывалася ў малюсенькай салі малага пахароннага бюро. У гэтым памешканьні можа быць разам толькі некалькі асоб. Улада забараніла выстаўляць целы забітых у іншых гарадох. Затое дззволіла, каб у Бастоне яны былі выстаўлены да мінулае нядзелі. Па 5000 чалавек чакала чаргі, каб аддаць апошнюю пашану целам байцоў за справу свайго вызваленьня.

У нядзелю адбыўся вялізарны паход на магілкі, дзе трупы спалены.

Будова памятніка.

Камітэт абароны пастанавіў пабудаваць памятнік.

Бомба ў Бальтіморы.

У Бальтіморы выбухнула бомба, крэпка папсавана каналізацыя і аграмадны дом выстаўкі. Аднак, мэта ўзрыву — разбурэньне сыстэмы каналізацыі ў Бальтіморы — не дасягнута. Ахвяр ня было.

Крывавыя бойкі ў Бастоне.

У Бастоне дайшло паўторна да бурных боек з паліцыяй з прычыны абурэньня, выкліканага забойствам Сакко і Ванцэтті. Паліцыя з трудом апанавала палажэньне. Вельмі шмат раненых.

Мэксыка.

У Мэксыцы з вялікім пасьпехам прайшла генаральная забастоўка, абвешчаная з прычыны забойства Сакко і Ванцэтті.

Маніфэстацыі ў Францыі.

Асабліва бурны водгалас мае забойства Сакко і Ванцэтті ў Францыі. У папярэднім нумары мы ўжо ў кароткіх рысах паведамлялі аб тых забурэньнях, якія былі ў Францыі. Аднак, яшчэ дагэтуль францускія работнікі ня могуць супакоіцца. Француская прэса ўсьцяж паведамляе аб далейшых дэманстрацыях і бойках з паліцыяй. Пасьля аўторкавых крывавых падзей, якія зрабілі шкоды на 10 мільёнаў франкаў, вечарам у сераду і чацьвер дайшло да новых боек з паліцыяй на тым-жа самым Сэвастопальскім бульвары. У сераду была зноў страляніна, але гэтым разам без ахвяр. Паліцыя масава арыштоўвае дэманстрантаў.

У Гаўры на мітынгу былі выкрыты 4 шпікі. Натоўп з абурэньнем кінуўся на іх. Спроба ўцячы не ўдалася, і ўзнялася бойка. Адзін з шпікоў паважна ранены ў жывот.

У Ніццы дайшло апошнімі днямі да паважных забурэньняў. У часе дэманстрацыі адбыліся бойкі між дэманстрантамі і паліцыяй.

Рада міністраў сабралася на надзвычайнае паседжаньне з прычыны астатніх падзей. У сувязі з тым, што ў часе дэманстрацыі дэманстранты аплявалі гроб Невядомага Жаўнера, зроблены буржуазіяй, каб кананізаваць сьмерць „за бацькаўшыну" (—чытай: за прагавітасьць фінансавых магнатаў!), рада міністраў пасьля адбытага паседжаньня пайшла засьведчыць сваю пашану да гробу Няведамага Жаўнера. Сумліўна, ці зможа гэтае хаджэньне з паклонамі вярнуць утрачаную масамі пашану да сьмерці за зыскі сваіх прыгнятацеляў, за іх панаваньне.

У сувязі з абурэньнем, якое пануе ў масах з прычыны забойства Сакко і Ванцэтті, пераважная большасьць прэсы адгаварывае ўрад ад ладжаньня ўрачыстасьцяў 19 верасьня ў чэсьць амэрыканскага легіёна і ад абвяшчэньня гэтага дня нацыянальным сьвятам. Урад трывае пры сваім праекце.

„Трымай язык за зубамі".

„Бэрлінэр Тагеблят" даносіць з Мадрыду, што ўрад Прыма-дэ-Рывэры забараніў гішпанскай прэсе зьмяшчаць якія-кольвечы весткі аб здарэньнях у Амэрыцы, маючых сувязь з забойствам Сакко і Ванцэтті. У сувязі з гэтай забаронай гішпанскія газэты дагэтуль не зьмясьцілі ніводнае весткі аб зробленым забойстве. Газэта, якая зьмясьціла вестку аб выбуху бомбы ў Бастоне, была сканфіскавана.

Ці ня гэткай-жа палітыкай буржуазных тэлеграфных агенцтваў і прэсы тлумачыцца гэткая нязвычайная цішыня ў Амэрыцы? Гэтае пытаньне, на наш пагляд, мае тым больш падстаў, што буржуазная прэса не падае навет вестак аб звычайных дэманстрацыях абурэньня, якія адбываюцца ў Амэрыцы.

Найлепшы адказ на судовае забойства.

Быццам у адказ на судовае забойства двух палітычных вязьняў у Амэрыцы ў радзе дэмакратычных краёў парляманты пастанавілі **скасаваць зусім кару сьмерці.**

Так, напрыклад, у Швайцарыі соймавая камісія—большасьцю галасоў **проці 5 паслоў каталіцка кансэрватыўнай партыі** — пастанавіла скасаваць цалком кару сьмерці. Як ведама, у Швайцарыі кара сьмерці ўтрымалася дагэтуль толькі ў некалькіх кантонах.

Таксама і ў Даніі міністар справядлівасьці заявіў — у гутарцы з журналістамі з прычыны забойства вязьняў амэрыканскім судом, — што ў новым данскім карным кодэксе, які хутка ўвойдзе ў жыцьцё, **кары сьмерці ўжо ня будзе.**

З кангрэсу нацыянальных меншасьцяў.

Мы ня маем пакуль-што дакладных вестак за кангрэсу нацыянальных меншасьцяў, які толькі што закончыўся ў Жэнэве, і да якога мы йшчэ вернемся, атрымаўшы аб яго працах точную інфармацыю. Цяпер падамо—за тэлеграфнымі паведамленьнямі — вестку аб сэнсацыйным выхадзе з складу кангрэсу ўсіх „польскіх меншасьцяў"—перадусім з Нямеччыны, а пасьля і з іншых краёў, як Латвія, Літва і інш.

Польскія меншасьці, якія на папярэднім кангрэсе йгралі пэўную ролю, на гэтым—перад пануючымі ўплывамі нямецкіх меншасьцяў — страцілі ўсялякі ўплыў на пастановы кангрэсу. Дзеля таго,—прычапіўшыся да адмовы (часовай) кангрэсу прыняць у свой склад, як асобную меншасьць, нямецкіх „фрызаў", польскія меншасьці раптам выйшлі з складу кангрэсу. Гэнаральны сэкрэтар „Союзу Нацыянальных Меншасьцяў у Нямеччыне" п. Карчмарэк зрабіў на кангрэсе заяву, тлумачучы выхад палякоў з яго складу, у якой сцьвярдзіў, што—„з прычыны адмовы прызнаньня і прыняцьця фрызаў"—усе меншасьці, аб'яднаныя ў гэтым Саюзе, выступаюць з кангрэсу дый займаюць—крытычнае і „чакаючае" становішча. — „Кангрэс ашукаў надзеі тых, хто думаў, што кангрэс мае бараніць ды ахоўваць слабыя нацыянальныя групы"... „Сталася ясна, што кангрэс зрабіўся прыладай нямецкай палітыкі, маючы на мэце перадусім інтарэсы нямецкага пашырэньня, але ня ідэйнай аховы правоў меншасьцяў"...

Запраўды-ж, нячувана пекна для нас—тутака пад Польшчай—выглядаюць нямецкія палякі—ў вопратцы „ідэйных абаронцаў правоў нацыянальных меншасьцяў"!...

Польскае агенцтва даносіць, быццам да гэтай заявы польскага дэлегата далучыліся і іншыя меншасьці ў Нямеччыне—сэрба-лужыцкая, данская і літоўская. Але той-жа „ПАТ" сцьвярджае, што гэтыя меншасьці заявілі, што іх выступленьне не скіравана проці прэзыдыуму кангрэсу (асобы докт. Вільфана), да якога яны ўсе (знача: апроч палякоў) маюць поўнае даверые. Пасьля заявы палякоў выступілі з даўжэйшымі дэклярацыямі дэлегаты ўкраінскіх, жыдоўскіх, нямецкіх, вэнгерскіх і інш. меншасьцяў, якія высказалі свае поўнае даверые да прэзыдыуму ў асобе старшыні докт. Вільфана. Дык усё гэта наводзіць на думку, што і рэшта нацыянальных меншасьцяў у Нямеччыне зусім не падтрымалі так, як піша п. „ПАТ", заявы польскіх дэлегатаў...

Пасьля выслуханьня ўсіх гэтых дэкляраццяў кангрэс хуткім тэмпам правёў рэшту свaей праграмы. — Абгаворана была справа Статуту Меншасьцяў, які-б азначыў нармальныя праўныя формы істнаваньня меншасьцяў у-ва ўсіх краёх. Прынята шмат рэзалюцыяў, паміж іншымі — рэгулюючая адносіны кангрэсу да Лігі Народаў. Гэтая цікаўная рэзалюця сцьвярджае, што—„міжнародава — загарантаваныя правы меншасьцяў, а так сама іх правы на ўласны самаўрад не пярэчаць сувэрэннасьці дзяржаваў, дзе жывуць меншасьці, ані характару ды імкненьням Лігі Народаў...

Польскія агенцтвы вельмі скупа кажуць аб гэтых рэзалюцыях... Ведама ўсім, як ня хочуць палякі гэтых „міжнародава-праўных гарантыяў" для меншасьцяў, як зьбівалі яны заўсёды нейкі „агульны, нармальны Статут для меншасьцяў", пазываючыся на патрэбу „датарнаваць кожны статут да асаблівых варункаў кожнай меншасьці ў паасобных дзяржавах"... Відаць—як раз з прычыны гэтага „нямецкага кірунку" прац кангрэсу і выступілі польскія меншасьці з яго складу, а ня дзеля пекных вочаў нейкіх там „фрызаў" у Нямеччыне...

Новая „праграма“ польскіх абшарнікаў.

Збожжа ды хлеб ня толькі не таньнее, але даражэе!

Дзіўнае зьявішча: збожжа, ня гледзячы на новы ўраджай, значна лепшы за леташні — ня толькі не таньнее, але — наадварот — даражэе! Прэса сьцьвярдзіла, што цэны на збожжа ў „рольнічай Польшчы“ — значна вышэйшыя, чым навет заграніцай — у прамысловых краёх Эўропы..

Цэны, зразумела, значна ўзрасьлі перад новым хлебам, калі прыйшлося прывозіць значныя масы збожжа ды мукі з заграніцы. А гэта — дзеля таго, што ўрад у свой час дазволіў абшарнікам вывезьці амаль ня ўсё збожжа з краю заграніцу, даўшы ім гэткім спосабам падвойна зарабіць. Але чаму-ж цяпер цэны не спадаюць?

Не спадаюць таму, што — пад націскам прэсы — урад рашуча заявіў, што цяпер ужо дык не: не дазволіць больш вывазіць збожжа з краю, але.. будзе сам купляць — на запас, каб забясьпечыць насяленьне, а перадусім — армію ад бяхлеб'я... урад заявіў, што будзе рабіць вялізарныя закупы на запас, дзеля чаго мае пабудаваць вялізарныя склады. Аднак, праўду кажучы, ніякіх складаў урад дагэтуль яшчэ не пабудаваў; дык адзіным вынікам гэтай „баявой“ заявы ўраду зьявілася тое, што яго ўкаханыя абшарнічкі, чакаючы на гэтыя „вялізарныя закупы“, трымаюць пакуль-што збожжа ў таках ды стагох, а перадусім—ня спускаюць цэнаў на збожжа, якія панавалі „на прадвоўку“.

Гэтыя паны „аб'яднаныя абшарнікі“ дайшлі да таго, што зьвярнуліся — праз свае экспазытуры — да ўраду з трэбаваньнем ізноў спыніць, як дагэтуль было, усялякія перашкоды дзеля вывазу збожжа заграніцу, скасаваўшы ўсялякія вывазныя мыты. Але — на ўсялякі выпадак, калі-б урад, пад націскам абуранай апініі краю, не згадзіўся б у гэтым годзе напіхаць кішані абшарнікаў — коштам рэшты насяленьня краю, — абшарнікі трэбуюць, каб пры закупах урад плаціў ім за збожжа цэны — „вышэйшыя, чым на сусьветным рынку“...

Запраўды-ж — дасьціпнае дамаганьне: ці-ж канешна трэба вывазіць збожжа з краю, клапаціцца і выдаваць грошы дарма, — калі можна тутака, „у сябе дома“, націснуць на ўрад, каб узяў збожжа на месцы дый яшчэ даў цэны, вышэйшыя, як за граніцай?!

І вось — „праграма абшарнікаў“ выконываецца на ўсім фроньце — салідарна ўсімі іх арганізацыямі, прэсай і „прафэсыянальнымі саюзамі“. З аднаго боку — трымаюць збожжа ў снапох, паддзержываючы гэтак высокія цэны; а з другога боку — даводзяць у сваей прэсе, што ўраджай на жыта ды пшаніцу — горшы за леташні...

Навет такія „паважныя“ органы прэсы (абшарнікаў), як кракаўскі „Час“, ня кажучы ўжо аб органе прафэсыянальных спэкулянтаў — абшарнікаў як “Варшавянка“, — падтрымліваюць Мэмарыял аб'яднаных абшарнікаў да ўраду, які трэбуе, каб урад — за забарону вывазу збожжа заграніцу — даў „сваім“ абшарнікам „адшкадаваньне“ — коштам рэшты насяленьня, плацячы вышэйшыя за сусьветныя цэны за іхняе збожжа ў краі... І вось — пад музыку гэтых Мэмарыялаў ды газэтных артыкулаў—у краі ідзе запраўды-ж нячуваная нідзе вакханалія ўзросту цэнаў збожжа. Ня гледзячы на тое, што Статыстычны Камітэт выразна сьцьвярдзіў, што сёлета ўраджай на 15 — 20 прац. вышэйшы, як леташні, — цэны на жыта за адзін апошні тыдзень **падскачылі аж на 2 з паловай зл. за 100 кіляграмаў**.

Цэны на збожжа ў краі гэткім чынам робяцца ўжо большымі, чым заграніцай.. Ці-ж ня ясна, што гэткім спосабам абшарнікі робяць для сябе **ня толькі няшкоднай, але папросту — выгаднай, забарону вывазу збожжа з краю?!** „Ня кіем, дык палкай“ хочуць абшарнікі выкалачываць жываедна—спэкулянцкія зыскі з кішанёў рэшты насяленьня Польшчы...

Што будзе рабіць урад, маючы ў сваім складзе, як сваю галоўную падпору, павадыроў — паўнамоцнікаў польскага абшарніцтва? — паглядзімо...

Да польска-радавых адносінаў.

Новыя польскія пляцоўкі ў Маскве

Рада Міністраў мае на бліжэйшым паседжаньні зацьвярдзіць пастанову міністра заграніцчных спраў аб утварэньні ў Маскве становішча польскага гандлёвага радцы, а таксама прапазіцыю Прэзыдыуму Рады Міністраў аб адкрыцьці ў Маскве-ж аддзяленьня Польскага Тэлеграфнага Агенцтва („ПАТ'а“).

Кандыдаты на радавага пасла ў Варшаве.

Чычэрын быццам заявіў, што кандыдатура сябры Калегіі Заграніч. спраў Стомонякова, якая дагэтуль лічылася наймацнейшай, перастала быць актуальнай (зьнята). Гэткім чынам, астаецца даўно называныя кандыдатуры Аралава і Лёрэнца.

Пасол Патэк у Чычэрына.

Нямецкае агенцтва даносіць, што пасол Патэк — у той-жа дзень, як прыехаў у Маскву,—быў прыняты Чычэрынам, з якім гутарыў аж паўтары гадзіны. Польскі пасол быццам прадставіў Чычэрыну польскія прапазіцыі ў справе трактату аб узаемных гарантыях. Чычэрын быццам заявіў, што заўтра-ж даложыць гэтыя прапазіцыі Радзе Народных Камісараў. Агенцтва даведалася, быццам на будучым тыдні радавы ўрад мае ўжо назначыць новага пасла ў Варшаву.

Абмен вязьнямі.

У хуткім часе мае быць дакананы новы абмен палітычнымі вязьнямі—між Польшчай з аднаго боку і СССР ды Літвой—з другога.

Для выкананьня абмену з СССР асталося толькі скончыць з некаторымі фармальнасьцямі. Перагаворы скончаны па сутнасьці: СССР выдасьць Польшчы 39 вязьняў, за што Польшча аддасьць Радам 9... Літва выдасьць Польшчы 10 вязьняў узамен за 5 7 палякоў з Літвы. Абмены будуць выкананы праз Чырвоны Крыж.

Радавая улада—аб магчымасьці вайны.

Толькі-што адбытая сэсія найвышэйшых законадаўчых і выканаўчых уладаў СССР — у сваіх цікаўных—паміж іншым высказаліся ў справе, якая бязумоўна павінна найбольш цікавіць грамадзянствы, улады і народы, — **у справе магчымасьці і блізкасьці вайны.** Рэзалюцыя пленуму Цэнтральнага Камітэту проста кажа, што „небясьпека контррэвалюцыйнай вайны ёсьць самая вострая справа бягучага часу“... Тая-ж рэзалюцыя сьцьвярджае выразна, што небясьпеку гэтую стварае англійскі імпэрыялістычны ўрад... А сьледам за гэтым—11-га жніўня—Рыкоў у сваім дакладзе адзначыў асаблівае напружаньне міжнародавых адносінаў навакол СССР і падрыхтоўкі проці Радаў вайны, якую вядзе, зразумела, тая-ж англійская буржуазія.

Англія — казаў Рыкоў — вядзе падрыхтоўку вайны з Радамі на ўсіх фронтах: ваенным, дыпляматычным, гаспадарчым... На апошняй сэсіі Лігі Народаў англійскія дэлегаты рабілі вялізарныя высілкі, каб прыцягнуць да гэтае справы, каго толькі маглі.. Радавыя ўлады, як і ўсе бяз вынятку пасобныя павадыры СССР, **лічаць падрыхтоўку вайны проці СССР — абсалютна сьцьверджаным фактам.**

Калі-ж, як хутка можа выбухнуць гэтая вайна? У гэтым пытаньні думкі разыходзяцца. Адны лічаць, што ў бліжэйшыя гады вайны спадзявацца ня можна; другія, наадварот, перакана765ны, што вайна ў бліжэйшым часе абсалютна няўхільна... Пленум Цэнтр. Камітэту ў сваей рэзалюцыі заняў быццам сярэднюю пазіцыю: ён сьцьвярдзіў „гістарычную няўхільнасьць вайны наагул і яе верыгодную магчымасьць у бліжэйшы час“. А ў далейшым,—каб падчыркнуць мірныя імкненьні СССР, які ня хоча накіданай яму вайны, хаця ясна бачыць яе небясьпеку й няўхільнасьць наагул,—рэзалюцыя сьцьвярджае, што ня ўсе спосабы недапушчэньня выбуху вайны выпрабаваны, а дзеля таго даручае Радаваму ўраду прыняць усе меры, каб памагчымасьці адцягнуць мамэнт выбуху вайны, які наагул няўхільны. Тлумачучы прынятую рэзалюцыю, радавая прэса таксама сьцьвярджае, што вайна, хаця і не пагражае СССР у бліжэйшыя месяцы, аднак-жа бяссумліўна выбухне ў працягу бліжэйшых гадоў.

Разглядзеўшы рэальную міжнародавую абстаноўку навакол работніцка-сялянскай Рэспублікі з пункту гледжаньня ваеннай небясьпекі, Рыкоў у сваім дакладзе ставіць пытаньне аб той тактыцы, якую трэба прыняць радавай уладзе і міжнародаваму пралетарыяту — у прадбачаньні грознай небясьпекі. Адзінае апраўданьне, адзіны сэнс гэтай вайны — у тым, што яна няўхільна выкліча сусьветную рэвалюцыю. Дык вось, з гэтага і вынікае адзіная магчымая тактыка сусьветнага пралетарыяту—у прадбачаньні новай вайны. Пралетарыят усіх краёў павінен наперад запэўніць магчымасьць — безадкладна пасьля выбуху вайны проці СССР з боку буржуазных дзяржаваў — зараз-жа ператварыць яе ў хатнюю вайну пралетарыяту кожнай дзяржавы, проці яе буржуазнага ўраду і капіталістаў свайго краю. Далейшым актам, які безадкладна пасьля выбуху вайны павінен быць зроблены пралетарыятам кожнай дзяржавы, зьяўляецца захват ім улады.

З вялікім дакладам аб тым-жа тактычным пытаньні выступаў на сэсіі і Калінін. І ён сьцьвярдзіў рашуча, што вайна—блізкая. Дык трэба бясспынна казаць пралетарыяту ўсяго сьвету аб пагрозе, якая ідзе на адзіную дзяржаву працоўных у сьвеце, бараніць якую—першы абавязак працоўных усяго сьвету... І Калінін сьцьвярдзіў, што будучая вайна зараз-жа „пераліецца праз геаграфічныя і палітычныя граніцы, прыняўшы формы хатняй вайны паміж клясамі“... У кожнай ваюючай дзяржаве „нацыянальнае адзінства“ будзе разламана: міжнародава-салідарныя клясы будуць спачуваць адзін аднаму—праз граніцу—проці сваіх клясавых ворагаў у ўласнай дзяржаве. „Паражэнства“ будзе агульным зьявішчам.

Барацьбіт за незалежнасьць Эгіпту.

У Каіры памёр слаўны павадыр эгіпецкіх незалежнікаў, стары рэвалюцыянер Заглул паша, колькіразовы прэм'ер эгіпецкага ўраду, заклятый вораг англійскіх захватчыкаў Эгіпту.

У апошнія часы Заглул-паша быў старшынёй эгіпецкага парляманту, які распачаў новую пляновую, спакойную, разьлічаную на даўжэйшую мэту, але рашучую акцыю проці панаваньня Англіі над незалежным Эгіптам. У 1910 г. Заглул-паша быў павадыром паўстаньня, якое выбухнула проці Англіі. Пасьля няўдачы паўстаньня Заглул-паша стануў на чале руху эгіпецкіх нацыяналістаў-незалежнікаў, які прыняў больш умераныя формы, тактычна згадзіўшыся супрацоўнічаць з англійскімі ўладамі. Пасьля вайны Заглул быў даўгі час прэм'ерам, прычым шмат зрабіў для паступовага зьдзейсьненьня ідэі незалежнасьці. Так Англія фармальна абвясьціла Эгіпет „незалежным“, што, зразумела, вельмі мала ўплынула на фактычнае палажэньне краю. Але пад кіраўніцтвам Заглула народ і грамадзянства ўсё больш крапчэлі ў сваей нацыянальнай, палітычнай і эканамічнай самастойнасьці, ня ўкрываючы ўжо сваей варожасьці да англійцаў... Дык апошнім трэба было, каб „здарылася“ нешта такое, што-б папсавала ці прыпыніла гэтую пляновую, залішне шпарка і ўдатна выкананую акцыю кіраванага Заглулам грамадзкага руху...—І вось—быццам на малітвы англійскага ўраду—здарылася забойства англійскага генаральнага камісара (сірдара) ў Эгіпце...

Англія добра скарыстала з „добрага здарэньня“ і—паміж іншымі трэбаваньнямі свайго ўльтыматуму—зажадала адстаўкі Заглула-пашы... Каб не правакаваць вайны і бамбардоўкі эгіпецкіх местаў англійскім флётам, чым ясна грозіла Англія „незалежнаму“ Эгіпту, свайму „раўнапраўнаму“ таварышу ў Лізе Народаў,—Заглул споўніў частку трэбаваньняў Англіі і сам вышаў у адстаўку. Але на зараз-жа распачатых новых выбарах правёў у новы парлямант вялізарную большасьць прыхільнікаў сваей партыі, яшчэ больш востра настроеных проці Англіі. Гэты парлямант амаль не аднагалосна выбраў Заглула за свайго старшыню, каб паказаць Англіі, што незалежніцкі рух, павадыром, якога быў Заглул, — ня толькі не зламаны, а—наадварот — яшчэ больш акрэп. І Англія змушана была лічыцца з так ясна выяўленай воляй народу.

Новы парлямант—пад кіраўніцтвам Заглула—працаваў усьцяж над пашырэньнем правоў і самастойнасьці краю. Крок за крокам адваёўваў ён свае правы ад англійскіх „дарадцаў“ і дыпляматычна круціўшагася між англійцамі і парлямантам ураду, а такжа „караля Эгіпта“ Фуада, які, даўно куплены й пастаўлены Англіяй на трон, быў гатовы рабіць усё, што толькі загадаюць яму яго паны пратэктары... Мы памятаем, як толькі што ізноў Англія зрабіла рашучы наскок на самастойнасьць Эгіпту, каб пазбавіць яго сваей уласнай арміі, ды аддаць уладу над усім ваенным бюджэтам краю ў рукі англійскага „інспэктара“, які-б меў „свабоду ад парляманту“ й быў падпарадкаваны толькі... каралю Фуаду, ды англійскаму „Высокаму Камісару“. Але парлямант — пад кіраўніцтвам Заглула-пашы — рашуча адмовіўся зацьвярдзіць такі „ваенны бюджэт Эгіпту“, заявіўшы, што на такую англійскую армію проці Эгіпту ён грошаў ня дасьць.

Новыя выбары павінны былі ізноў аканчальна вырашыць гэты канфлікт. Але да іх слаўны павадыр вызваляючагася народу не дажыў.

„Нафтавая вайна“.

Як ведама, тры наймагутнейшыя марскія дзяржавы падзяліліся на ваенныя фронты так, што на адным баку сталі Англія з Японіяй, а на другім — Амэрыка. Але ёсьць на сьвеце яшчэ адзін „сусьветны фронт“, бадай-што ня менш важны, а мо' яшчэ важнейшы, як гэты марскі: фронт нафтавы...

Як ведама, амаль ня ўсе марскія флёты, ня кажучы ўжо аб паветраным, які ўвесь жыве ды жывіцца нафтай, — пераводзіцца на нафтавую цягу... Дык вось і выходзіць, што ў канцы канцоў марскі фронт цалком залежыць ад нафтавага... А на гэтым сусьветным нафтавым фроньце канкуруюць таксама тры наймагутнейшыя „нафтавыя“ дзяржавы сьвету, толькі крыху іншыя, дый злучаны, ці падзелены яны — інакш... Проці адной Англіі стаяць, як рашучыя ўжо саюзьнікі, Амэрыка і СССР...

Трэба адзначыць зусім ясна і выразна: як ні стараліся ўсе дзяржавы „англійскага проціразавага фронту“ націскаць на Амэрыканскі ўрад, каб той спыніў ды забараніў зьбліжэньне й саюз амэрыканскай нафты з радавай, гэты саюз стаўся бясспрэчным фактам. Радавае нафтавае таварыства ўвайшло ў цеснае паразуменьне з найвялікшай у сьвеце, праўда — пасьля Англійскай кампаніі (англа-галяндзкай) Рояль Шэл Дэтч, — амэрыканскай кампаніяй Штэндэрд Ойль, якая ўзялася пусьціць у ход радавую нафту па ўсім сьвеце, ня гледзячы на забарону ды перашкоды з боку Англіі, навет — выціскаючы англійскую нафту з Англійскіх і іншых краёў, дзе дагэтуль панавала выключна англійская нафта...

Трэба добра зразумець, якую сілу нафта, а перадусім манаполія на яе, у тым ці іншым краі, дае „нафтавай дзяржаве“. Напрыклад, амаль не па ўсім сьвеце Англійская кампанія Шэль Дэтч пабудавала ў партох нафтавыя склады, якімі карыстаюцца ўсе ваенныя і тарговыя караблі ўсіх дзяржаваў... Гэтым адным Англія, ня кажучы ўжо аб сіле яе флёту, трымае ў сваіх руках цалком судаходзтва цэлага раду дзяржаваў, якія ня маюць сваей нафты... Дык ня толькі сілай свайго флёту, але і сваей нафтай Англія пануе над усей Азіяй, Афрыкай, над усімі галоўнымі і другараднымі таргова воднымі шляхамі ўсяго сьвету...

І вось, Амэрыка, рыхтуючыся да барацьбы з Англіяй на моры, пастанавіла перадусім — выбіць з рук сваей праціўніцы гэты, мо' найвялікшы, козыр: нафтавы...

Ізноў падчырківаем, што адзіны на ўсім сьвеце існуе рэальны ды магутны саюзьнік для Амэрыкі ў барацьбе з Англіяй на гэтым сусьветным фроньце: гэта СССР... Радавы ўрад, ведама-ж, добра разумеючы ўсё гэта, пайшоў на далёкія ўступкі амэрыканскай кампаніі, якая ўзялася за гераічную барацьбу з англійскай нафтавай манаполіяй у сьвеце. Радавы ўрад з свайго боку, апрача вялізарных запасаў бакінскай нафты, дае ў распараджэньне амэрыканскай кампаніі якраз тое, што патрэбна Амэрыцы: дае рад нафтавых станцыяў на сваім узьбярэжжы на Далёкім Усходзе, каб выбіць адтуль англійскую нафту. Такія-ж нафтавыя склады — станцыі амэрыканская Кампанія пачала будаваць усюды на сьвеце — побач з англійскімі, пазбаўляючы гэтым Англію яе нафтавай манаполіі, якая дагэтуль служыла Англіі магутнай прыладай дзеля палітычнага націску і ўплыву на ўсім сьвеце... Лёгка зразумець, якую аграмадную і далёка сягаючую ў сваіх скутках акцыю распачалі два новых саюзьнікі на запраўды-ж сусьветным фроньце проці Англіі...

Ці-ж трэба казаць, які страшэнны перапалох выклікала ў Англіі вестка аб гэтым паразуменьні між амэрыканскай і радавай нафтай?! Радавая нафта, атрымаўшы амэрыканскі „пашпарт“, адразу робіцца „грамадзянінам сьвету“, проці якога ніякі англійскі байкот нічога зрабіць ня можа...

Але Англія прыняла вызаў.— У справу, як кажуць апошнія весткі, яўна і адкрыта ўмяшаўся англійскі ўрад. Узлаваны, ён загадаў толькі што абодвум дырэктаром радавага Нафтавага Таварыства пакінуць межы Англіі. Апроч таго, англійскі ўрад абяцаў англа-галяндзкай кампаніі Шэль Дэтч усялякую дапамогу... Англійская буржуазная прэса—пад націскам Кампаніі ды ўраду — пусьціла лёзунг: „Далоў з ужываньнем крадзенай (?) расейскай нафты“... „Крадзенай“— гэта мае значыць, што англійскія канцэсіі ды іншыя ў Баку былі скасаваны радавым урадам дый зроблены ўласнасьцю дзяржавы. Асьмеленая падтрыманьнем з боку англійскага ўраду, англійская нафтавая кампанія кінулася ў наступленьне, каб падарваць сілу амэрыканскай кампаніі: яна пачала будаваць вялізарныя склады—на тэрыторыі Злучаных Штатаў, якія даюць—навет коштам часовых матэрыяльных ахвяраў — пабіць таннай канкурэнцыяй амэрыканскую кампанію ў яе айчыне, у самай яе крыніцы ды калысцы.

Гэта-ж, ведама, толькі больш „раскачала“, як кажуць расейцы, амэрыканцаў... — Амэрыканская кампанія адказала на гэта больш цесным саюзам з радавай, даўшы апошняй кампаніі значную грашовую пазыку... А калі раскрыць, што радавая нафтавая кампанія—гэта-ж ня хто іншы, як—радавы ўрад, а, з другога боку, уцяміць, што амэрыканскія законы даюць права амэрыканскаму ўраду „кантраляваць“ так сама ўсе, навет прыватныя пазыкі заграніцу, дык стане ясным, як хітра ды „шчыра“ працуе Англія над паразуменьнем—ужо ня толькі між амэрыканскай і радавай нафтай, але і—між Амэрыкай і Радамі, якіх толькі-што за ўсялякую цану манілася пасварыць не на жыцьцё, але — на сьмерць...

Можна думаць, што Англія хутка зразумее, якую няроўную барацьбу распачала яна, дый захоча неяк паразумецца з амэрыканскай нафтай. Але—за гэта-ж пэўна англійскаму ўраду прыдзецца заплаціць Амэрыцы—не танней як — „першынствам свайго флёту ў сьвеце“... Дык радаваму ўраду, які ад гэтага паразуменьня страціць значныя козыры ў сваей міжнародавай палітыцы, трэба выкарыстаць час, каб перадусім зьвязацца гаспадарчымі сувязямі з Амэрыкай чым сільней і хутчэй...

Апошнія весткі кажуць аб новым вялізарным паражэньні Англіі і аб пасьпеху яе праціўнікаў на гэтым нафтавым фроньце. — Пасьля доўгіх перагавораў радавы ўрад атрымаў ад пэрскага ўраду выключнае права эксплёатацыі вялізарных нафтавых абшараў паўночнай Пэрсіі. Гэтыя арэндаваныя Радамі абшары радавы ўрад прапануе цяпер амэрыканскай кампаніі...—Пэўна ж — за тыя ці іншыя кампэнсацыі... Гэтым самым Амэрыка ўваходзіць у Пэрсію, дзе дагэтуль канкуравалі толькі Англія і СССР.—Аб значэньні гэтага новага пасьпеху „саюзьнікаў“ казаць доўга ня трэба...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Сойм павінен быць скліканы не пазьней 10-га верасьня.

Толькі 27-га жніўня старшыня Сойму здолеў прадставіць п. Прэзыдэнту Рэспублікі заявы, пакрытыя патрэбнай лічбай подпісаў, з дамаганьнем скліканьня надзвычайнай сэсіі Сойму. На падставе Канстытуцыі, Прэзыдэнт павінен скліканць Сойм не пазьней, як у працягу 14 дзён пасьля падачы яму такой заявы.

Заяву падпісалі гэткія соймавыя клюбы: Эндэкаў, Хадэкаў, „Хрысьціянскіх-нацыяналістаў" (абшарнікі Строньскага), Пяста, Вызваленьня, ППС. Не падпісалі заявы два ўрадавыя клюбы: Партыя Працы (5 паслоў) і „Сялянскі Саюз", ды клюбы меншасьцяў.

Клюбы меншасьцяў не падпісалі дзеля таго, што баяцца, каб польская большасьць Сойму не скарыстала з надзвычайнай сэсіі для прыняцьця крыўднага для меншасьцяў самаўрадавага закону, а галоўным чынам — для зьмены (пагоршаньня) выбарнага закону ў парлямант. Есьць падставы думаць, што ў апошні мамэнт можа наступіць паразуменьне між гэтай большасьцю парляманту і ўрадам—дзеля такое зьмены. Галоўным-жа зьместам ды мэтай зьмены выбарнага закону зьяўляецца абмяжаваньне прадстаўніцтва меншасьцяў у парляманьце.

Дэкрэт Прэзыдэнта аб эміграцыі.

Міністэрства Працы апрацавала дзеля падпісу п. Прэзыдэнта новы дэкрэт у справе рэгуляваньня эміграцыі. Дэкрэт складаецца з 9 аддзелаў, трактуючых аб парадку выезду заграніцу—на заробкі—ды аб ахове польскіх эмігрантаў у часе падарожы і заграніцай польскім урадам. Дэкрэт забараняе, як праступленьне, „намову да эміграваньня (выезду настала) з краю", ды ўсялякае „пасрэдніцтва без упаважненьня ад уладаў" у справе эміграцыі.

29 жніўня дэкрэт меў разглядацца Радай Міністраў.

„Вугальны канфлікт" між Польшчай і Чэха-Славакіяй.

Польшча не дайшла да згоды з Чэха-Славакіяй ў справе абмену вугальлем. У выніку спрэчкі польскія капальні вугальля пастанавілі стрымаць давоз вугальля чэха-славацкім фабрыкам. На гэта чэха-славацкія коксавыя заводы пастанавілі ня ўвозіць у Польшчу коксу, пакуль ня будзе ўрэгулявана дастаўка вугальля з Польшчы...

„Вырадак" польскай прэсы.

Навет найбольш жываедныя з органаў польскага „правага фашызму", устрымаліся ад выяўленьня свайго „здаваленьня" з прычыны „электрычнага забойства" амэрыканскім „судом" двух вязьняў-работнікаў... Але знайшоўся ж такі ў Польшчы „орган прэсы", які публічна заявіў, што ў ім (хто-ж гэта „ён", каго-ж гэта прадстаўляе „апінія" гэтага органу?!) выкананьне прысуду сьмерці над Сакко і Ванцэтті „будзіць пашану" да судовай улады ў Амэрыцы.

Гэты орган прэсы—„Польска Збройна"...

Эндэцкі генарал Загурскі прапаў бяз сьледу.

Прайшлі ўжо тры тыдні, як прапаў бяз сьледу генарал Загурскі, які больш году быў трыманы ў Віленскім ваенным вастрозе — пад цяжкімі закідамі вялізарных надужыцьцяў пры заказах на патрэбы польскага лётніцтва заграніцай.

Уся польская прэса, асабліва правая, страшэнна хвалюецца гэткім зьнікненьнем польскага генарала — тым больш, што яно мела месца пры абставінах вельмі няясных, каб не сказаць „таёмных"... Бо-ж аказалася, што генарала вязьлі з Вільні ў Варшаву 2 афіцэры, з якіх адзін быў асабістым ад'ютантам марш. Пілсудскага. Вязьлі, прывязьлі і ў Варшаве неяк выпусьцілі на волю, хаця, здавалася-б, рабіць гэтага ня мелі права, бо ген. Загурскі лічыўся ўсьцяж вязьнем. Гэта тым больш дзіўна, што генарал мусіў заразжа, назаўтра, зьявіцца да марш. Пілсудскага — „з рапартам". „Роботнік" лічыць такую „лёгкамыснасьць вайсковых уладаў, якія не дапільнавалі, каб ген. Загурскі стануў перад судом" — „карыгоднай". Але ў прэсе штодзень зьяўляюцца ўсё больш пікантныя весткі ды чуткі, з якіх можна зрабіць вывад, што ген. Загурскі, можа, і ня ўцёк заграніцу, як заяўлялі з перакананьнем адпаведныя вайсковыя ўлады. Нажаль, газэты, пераважна правыя, якія зьмяшчаюць гэтыя весткі, дамагаючыся ад ураду энэргічнага сьледзтва ў гэтай справе — папросту канфіскуюцца ўладамі... Ці гэта—адказ?!

„Kur. Poran." зьмясьціў запраўды-ж сэнсацыйную вестку — аб тым, што сьледчая ўлада зрабіла вобыск у... форце Легіёнаў, шукаючы там сьлядоў... ген. Загурскага... Гэта значыць, што сама ўлада дапускае ўжо магчымасьць таго, што генарал ня ўцёк заграніцу, але... „зьнікнуў" неяк інакш, пакінуўшы па сабе толькі—сьляды...

Прэса лічыць гэтае „зьнікненьне" цэлага вялікага генарала (г. Загурскі—выняткова высокага росту) у дзяржаве — скандалам сучаснага польскага „права парадку" раўнуючы гэты факт з падобным-жа „зьнікненьнем 10 афіцэраў, якія больш году назад зрабілі знамяніты бандыцкі напад уначы на кватэру пасла Зьдзеховскага, зьбіўшы яго да паўсьмерці. Прэса бачыць у абодвух „выпадках" — „стыль сучаснай памаёвай Польшчы"...

Чаму зачынілася газэта „Глос Цодзенны".

Кажучы ў адным з папярэдніх нумароў нашай газэты аб зачыненьні—быццам з прычыны 16 канфіскатаў за тры месяцы—эндэцкага органу „Глос Цодзенны", мы зрабілі падвойную абмылку.—Перад усім газэта гэтая—галоўны (здаецца і адзіны!) орган „Н. П. Р." — „работнікаў-нацыялістаў", аднаго з „фальваркаў эндэкцыі", але афіцыяльна-іншай ды самастойнай партыі, на чале якой стаіць пасол Попель. Другая абмылка — ў тым, што—як цяпер раскрылася на судзе над ген. Жымерскім, пасол Попель аказаўся вельмі „надмочаным" у надужыцьцях слаўнага генарала.—Партыйныя грошы, складаныя ў касу партыі абдуранымі работнікамі, выдаваліся старшынёй партыі на розныя яго асабістыя, прыватныя рэчы, але з другога боку, на выданьне газэты „Глос Цодзенны", той-жа п. Попель адабываў грошы з розных сваіх афэраў—у сувязі з пастаўкамі для арміі... Так прынамся даводзіў рад сьведкаў на судзе, так казаў і пракурор у сваей прамове... Калі роля п. Попеля на судзе высьнілася, „крыніца", жывіўшая дагэтуль „работніцкую" газэту, раптам „высахла".—Стуль і зачыненьне „забітай канфіскатамі" газэты „Глос Цодзенны"...

Пракурор вельмі востра ды важка казаў аб гэтым п. Попелю.—Ці выкруціцца гэты панок, ці выйдзе „сухім з вады", — як шмат іншых? цікаўна...

Заграніцай.

Адклад французска-радавых перагавораў.

Камісар заграніцных справаў ССРР Чычэрын запрасіў да сябе францускага пасла ў Маскве п. Эрбэта і заявіў яму, што проці недапусьціма вострай кампаніі францускай прэсы проці ССРР, а перадусім — такіх-жа выступленьняў паасобных францускіх міністраў, радавы ўрад змушаны заявіць рашучы пратэст. А дзеля таго, што ў такой нездаровай атмасфэры немагчыма спакойна весьці працу перагавораў у справе гаспадарчага і палітычнага паразуменьня, перагаворы гэтыя трэба, відаць, прыпыніць на 4 месяцы. Узнавіць перагаворы радавы ўрад будзе вельмі рад — пасьля 1-га студзеня новага году.

Ніякай халеры ў ССРР няма.

Радавае пасольства ў Варшаве заяўляе, што ўсе чуткі ды весткі, друкаваныя ўсьцяж польскай прэсай, аб быццам шалеючай на тэрыторыі ССРР, а перадусім — на абшары Радавай Беларусі, эпідэміі халеры,—папросту хлусьня. Ані ў 1926 ані ў 1927 гадах ня было на ўсей тэрыторыі ССРР ніводнага выпадку халеры.

Яшчэ адзін дзеяч Лігі Народаў паклаў аружжа.

Адзін з галоўных дзеячоў Лігі Народаў, англійскі бяззьменны дэлегат у ёй лёрд Сэсіль, як пішуць газэты, заявіў аб адмове прымаць учасьце ў дэлегацыі на верасьнёвай сэсіі. Сам Сэсіль не запярэчыў гэтай вестцы.

Ізноў шмат „гданскіх справаў" у Лізе Народаў.

Пан „ПАТ"—з абурэньнем паведамляе, што Данцыгскі Сэнат ізноў мае высунуць на верасьнёвай сэсіі Лігі Народаў шмат „гданскіх справаў", аб чым прэзыдэнт Сэнату п. Сан ужо заявіў у сваім апошнім экспозэ. Ізноў будзе паднята дамаганьне аб забароне Польшчы будовы складаў амуніцыі на абшары Данцыгскага порту; Сэнат будзе дамагацца забароны пастою ў порце Вольнага Места для польскіх ваенных караблёў; яшчэ тры справы маюць меншае палітычнае значэньне. „ПАТ" закідае ўладам Вольн. места жаданьне завалiваць Лігу сваімі спрэчкамі з Польшчай.

Сэнсацыйная заява б. канцлера Вірта.

Былы нямецкі канцлер (прэм'ер) Вірт заявіў у гутарцы з журналістам, што немцы ніколі не згаджаліся дый ня згодзяцца прызнаць законнымі й непарушнымі свае ўсходнія граніцы, асабліва-ж—недарэчны так-званы „польскі калідор". У Лёкарно немцы толькі абавязаліся не зьмяняць сваіх польскіх граніцаў сілай аружжа... Але гэта зусім ня значыць, што немцы ня зьбіраюцца дый ня будуць тасаваць усялякіх іншых легальных спосабаў націску на Польшчу, каб яна дабравольна дала зьмяніць гэтыя недарэчныя граніцы.

Француская прэса вельмі жыва адгукнулася на гэтую заяву. Але навет „Тан" дапускае магчымасьць зьмены польска нямецкай граніцы — „але толькі з поўнай згоды з боку Польшчы". Газэта дадае, што ўсё-ж гэткая сталая акцыя немцаў, скіраваная да зьмены існуючага палажэньня над Віслай, прычыняецца да сталага ўтрыманьня ў Эўропе „духу непакою", нязгоднага з „духам Лёкарно".

Францускія гатэнтоты лічаць, відаць, што сталае ўтрыманьне акупацыйных арміяў у Надрэніі прычыняецца да ўтрыманьня ў Эўропе „духу супакою" ды згодна з „духам Лёкарно"?!

Як Францыя разбраяецца на моры.

Як ведама, Францыя зусім шчыра і адкрыта адмовілася ад учасьця ў „разбраенчай" канфэрэнцыі ў Жэнэве, на якой іншыя дзяржавы марочылі сьвет у працягу штосьці каля 2 месяцаў. Францыя адмовілася дзеля таго, што не захацела згадзіцца на абмяжаваньне свайго флёту дый на тую „рубежную лічбу" марскіх яго адзінак (рознага роду караблёў), якую „вызначыла" ёй Вашынгтонская Канфэрэнцыя. Як ведама, Францыю за гэта пасьля Вашынгтонскай Канфэрэнцыі страшэнна пакарала Амэрыка, амаль не дабіўшы дарэшты яе і без таго сухотную валюту. Англія была „спрытнейшай": яна сьпярша згадзілася з воляй Амэрыкі, пакуль ня выцягнула ад яе ўсё, што толькі магла. А пасьля — у Жэнэве ашукала яе на ўсей лініі, сарваўшы ня толькі Жэнэўскую, але ў сутнасьці і Вашынгтонскую Канфэрэнцыю. Францыя няраз заяўляла выразна, што хоча і павінна павялічываць свае збраеньні на моры—дзеля таго, каб „запэўніць сабе цалком сувязь і камунікацыю з сваімі афрыканскімі валадзеньнямі, якія складаюць інтэгральную (неадлучную) частку дзяржавы, без якой Францыя перастане быць вялікай дзяржавай". Італія будуе сабе флёт, каб мець магчымасьць—у патрэбны час — якраз перарэзаць Францыі марскі шлях, што лучыць яе з Афрыкай (Алжырам, Мароккам, Тунісам), на якую Мусоліні даўно заглядаецца, аблізываючы сабе лупы...

Адна з францускіх газэтаў падала цікаўныя лічбы, паказуючы, з якой хуткасьцяй ідзе будова францускага флёту ад 1920 г., навет у часы найбольшага фінансавага крызісу дый амаль не катастрофы францускай валюты. За 7 бяз малага гадоў (ад 1920 г.), францускі флёт павялічыўся аж на 74 баявыя адзінкі. У гэтай лічбе — 6 вялікіх крэйсэраў (да 10 тысяч тоннаў кожны), 31 мінаносец рознага тыпу, 18 падводных лодак вялікшага тыпу, 12—меншага тыпу. У гэтым годзе яшчэ мае быць скончана будова 6 мінаносцаў, 9 падводных лодак, дый 9 ваенных караблёў рознага іншага назначэньня. „Разбраеньне" ідзе.

Сталае „ахароннае" пусканьне крыві ў англійскай Індыі...

Мы няраз адзначалі тую старадаўную тактыку „пакераджаючага пусканьня крыві", якую ўсьцяж тасуе—асабліва цяпер—англійская ўлада ў сваей Індыі, каб мець апраўданьне дзеля сталага-ж павялічаньне паліцыі ды войска ў захопленым краі і сталага-ж тасаваньня ў ім паліцэйскіх ды вайсковых рэпрэсіяў. Англійская ўлада спрытна выкарыстывае дзеля гэтага даўную рэлігійную варожасьць між індусамі і мусульманамі ў краі. У кожнае сьвята першых або другіх узьнімаецца бойка, якая канчаецца дзесяткамі, калі ня сотнямі ахвяраў... Так, толькі-што ў самай сталіцы Індыі Дэлі на хаўтурох аднаго індуса, які быццам быў забіты мусульманінам, узьнялася бойка, у выніку якой шмат цяжка раненых, між імі і 6 паліцыянтаў. Паліцыя доўга не магла спыніць бойку, якая перакінулася ў іншых месцы места, ахапіўшы амаль ня ўсю сталіцу. Зараз-жа ўсе крамы былі зачынены, і места быццам вымерла. Толькі ваенна-паліцэйскія патрулі „ахоўвалі парадак"...

Камунікат у справе паўстаньня на востраве Ява.

Галяндзкі ўрад выдаў афіцыяльны камунікат — у справе паўстаньня на востраве Ява. Паўстанцы мелі згары абдуманы шырокі плян паўстаньня. Усе павадыры і дзеячы паўстаньня мелі сабрацца ў ўмоўленых месцах — быццам на вясельлі. Пасьля — у ўмоўлены час — адначасна кінуцца з аружжам на ўрадавыя ўстановы і захапіць іх сілай. Аднак-жа, паліцыі выдаліся падозранымі гэтыя „вясельлі", у якіх ня было жанчын. На адным з гэтых „вясельляў" паліцыя пачала рабіць арышты, выклікаўшы гэтым перадчасна выбух паўстаньня... Гэткім чынам разьбіўшы ўвесь плян, улады зьліквідавалі ўсё паўстаньне.

Галоўным павадыром паўстаньня аказаўся былы афіцэр—галандзец дэ-Жэр, адзін з важных урадоўцаў у Батавіі (галоўнае места краю), які ўжо арыштаваны. Далей у камунікаце — ужо нешта нясуразнае: быццам „канчальнае паўстаньне" мела адбыцца 1930 годзе, калі арганізатары яго мелі прывезьці на востраў 20 тысячаў кітайцаў... Тады замахоўцы мелі абвясьціць незалежнасьць Явы і дабіцца ў дзяржаваў — міжнародавай гарантыі сваей незалежнасьці — шляхам розных „канцэсіяў" для важнейшых з іх... Ну, ведама-ж—перадусім для Англіі і Японіі.

З гэтага відаць аднак-жа, наскольні нятрывалай зьяўляецца ўлада захватчыкаў — галяндцаў, дый як дрыжаць яны, ня гледзячы на сваю часовую перамогу, перад грознай, але няминулай для іх будучынай...

Ведама-ж, каб лягчэй ды „маральней" было бароцца з паўстанцамі, іх усіх абвясьцілі, як цяпер модна, „камуністамі"... Дык міністар калёніяў Галяндыі загадаў уладам на востраве Ява, як мага пільней, сачыць за „правамысьльнасьцяй" усіх урадоўцаў ды бяз жалю выганяць са службы й судзіць усіх, „замечаных у камуністычнай ці анты-мілітарыстычнай прапагандзе"... Ня можна навет лічыць злом вайну, бо-ж — ясна: камунізм!...

Кангрэс нэграў.

У Нью-Іорку распачаўся штогодны кангрэс усіх нэграў на сьвеце. Аб'яднаныя нэгры ставяць сабе, як ведама, мэтай—вярнуць „Афрыку афрыканцам", ці—нэграм, яе адвечным жыхаром, якіх у працягу сталецьцяў, як ведама, вывозілі з бацькаўшчыны гвалтам, як чорных рабоў, ды прадавалі, як быдла, у іншыя краі, пераважна — у Амэрыку. Як ведама, гэтым вельмі выгадным „промыслам" займаліся пераважна „асьвечаныя мараходцы"—„высока культурныя" англійцы...

Ад часу скасаваньня нявольніцтва ў Амэрыцы нэгры дайшлі тамака да вельмі значнага роўня культуры, маюць шмат сваіх культурна-нацыянальных і гаспадарчых установаў, лічаць тысячамі сваю інтэлігенцыю, якая працуе, канкуруючы з „белымі", у-ва ўсіх галінах культурнай працы.

Вастрожны кветнік.

Дзе ад топаля лісьцяў срабрыстых
Апускаецца бархату цень, —
З набяляных цагелак сьняжыстых,
Як вясковага пеўня грабен,
Зроблен кветнік. У дзень
Бзымчаць пчолкі, махнатыя мухі,
І пырхаюць над ім матылькі,
А эфірныя крыльлячкаў рухі,
Як ад сьвечкі мігцяць аганькі.

Тады мне ўсьміхаецца неба,
Шум травы зеленеючых ніў,
У гэткі міг мне нічога ня трэба:
Я красы чую ў сэрцы прыліў.
Чую рохат вячэрняй парою,
Жабаў крэхт каля багнаў—балот,
Дзе ў крывавым зіяньні зарою
Усьміхаецца міла чарот.

У гэткі міг мне нічога ня трэба,
Мне скрыгочуць ў траве кавалькі,
Мне ўсьмяхаецца сіняе неба
І вусаты ячмень, васількі.

Радасьць, радасьць па жылах агністая,
Як патокам зальець маю грудзь.
Бачу сіняе неба празрыстае
І жыцьця майго пройдзены пуць.

У гэткі міг мне нічога ня трэба:
Я красы чую ў сэрцы прыліў,
Бачу сіняе, сіняе неба
Каласоў хвалі сьпеючых ніў.

Алесь Салагуб.

Пасьля прагулкі, серада 22/VI. 27 г.

Як ведама, ня гледзячы на „роўныя правы" ды вялікія пасьпехі гэтых нэграў ў Амэрыцы, дзе знаходзіцца іх галоўны асяродак, белае насяленьне Амэрыкі адносіцца да чорных з дрэнна ўкрыванай ненавісьцяй ды пагардай... Дзеля таго кангрэс у Нью-Іорку мае сваей бясспыннай задачай працаваць над узмацненьнем ці паляпшэньнем фактычнага ды праўнага іх палажэньня. Але Кангрэс сабірае прадстаўнікоў нэгрскага насяленьня з 14 розных краёў Амэрыкі і Афрыкі, дык мае, як сказана вышэй, апрача мясцова-амэрыканскай, яшчэ і „ўсё-афрыканскую" мэту. Трэба дадаць, што „ўсе-нэгрскі рух" у Афрыцы мае ўжо такую сілу, што яго пачалі паважна баяцца тыя дзяржавы, якія пазахоплівалі сабе розныя афрыканскія краі, як калёніі... Калі, напрыклад, падрыхтаваўчы камітэт папярэдняга Кангрэсу захацеў зрабіць яго „ў сваей роднай Афрыцы", дык усе гэтыя каляніяльныя, імпэрыялістычныя дзяржавы, падзяліўшыя між сабой Афрыку, рашуча забаранілі кожцы, ня толькі на „сваей тэрыторыі" рабіць гэты кангрэс, але — навет на абшарах тых розных „самастойных" ды „незалежных" дзяржавак, дзе гэтыя каляніяльныя дзяржавы панасадзілі пакорных сабе „каралёў" ды „князёў", — з помачай якіх вельмі выгадна і спакойна эксплёатуюць мясцовае чорнае насяленьне.

Ізноў барацьба за Шанхай.

Паўночныя войскі, як пішуць газэты, стаяць у адлежнасьці ўсяго 150 кілямэтраў ад Шанхаю. У найважнейшым месьце Кітаю—паніка. Уся ўлада—дыктатарская—апынулася ў руках генарала Бай-Тсун-Чы. Але паўдзённыя войскі зусім ня страцілі духу й надзеі на перамогу. Ідзе вялізарная праца над абаронай места. Адначасна на фронт кінуты значныя сілы, дык справа яшчэ не праіграна цалком.

Апошнія весткі якраз і кажуць, што паўночныя арміі адкінуты значна назад, што чыгуначны шлях між Шанхаем і Нанкінам папраўлены і рух па ім узнавіўся. Гэтыя весткі варожаць новыя пасьпехі рэвалюцыйнаму войску, якіх трэба спадзявацца ў хуткім часе.

Ці ізноў перамена курсу?!

Тэлеграмы паведамілі, што з запячатанага па загаду Чанг-Кай-Шэка (пэўна-ж—па англійскай радзе)... аддзяленьня Радавага Банку ў Шанхаі зьняты пячаці. Ці-ж гэта — азнака новага курсу ў Шанхаі пад націскам новага руху ў Кітаі на карысьць Радаў?

Катастрофа на японскіх марскіх манэўрах.

У часе вялікіх начных манэўраў японскага флёту японскі крэйсар неспадзявана наскочыў на свой-жа мінаносец, які—разламаны на палову — у некалькі мінут пайшоў на дно разам з 100 матросамі ды афіцэрамі каманды... Адратаваны толькі 23 асобы... Амаль не адначасна другі крэйсэр таксама наскачыў на свой-жа мінаносец, якога штурхануў так сільна, што выкінуў з яго шмат людзей з каманды, з якой утанулі 27 чалавек. Мінаносец папсаваны да нягоднасьці.

ХРОНІКА.

Новыя высяленьні расейскіх эмігрантаў. Як падае „Słowo", польскі ўрад загадаў высяліць за межы Польскае дзяржавы Вячаслава Адамовіча, ведамага пад мянушкай „Дзяргача". Адамовіч быў „атаманам" дывэрсыйнае арганізацыі „Зялёны Дуб", якая займалася нападамі на мястэчкі па той бок радавае граніцы. Апошні тэрмін выезду—29-га жніўня. „Słowo" заяўляе, што высяленьне мае палітычны характар, але прычыны высяленьня не падае.

Тая-ж газэта падае вестку, што гэтак сама маюць быць выселены яшчэ дзьве асобы спаміж расейскіх эмігрантаў.

Загад аб выезьдзе ўжо атрымаў грам. Ромашов, які ў працягу 5 гадоў быў адказным рэдактарам мясцовай расейскай газэты „Виленское Утро". Газэта гэта была вельмі лаяльнага да Польшчы напрамку, а сам пан Ромашов запраўды-ж ня меў нічога супольнага ні з якой палітычнай ці грамадзкай, а навет з газэтнай дзейнасьцю, займаючыся ды цікавячыся выключна сваей працай страхавога агента, для якой яго становішча „рэдактара" было лішнім „козырам" пэўнай навагі...

„Клюб беларускае інтэлігенцыі". Польская прэса вельмі рэклямавала зацьверджаньне ўладамі новага клюбу (ці ня новае шулерні?!) пад назовам „Клюб Беларускае Інтэлігенцыі". З увагі на тое, што дагэтуль улады давалі канцэсіі на „клюбы" толькі так званым „полёнофілам" тыпу Валэйшы, Паўлюкевіча і ім падобных, а беларускаму грамадзянству ў дазволе systэматычна адмаўляла,—факт выдачы канцэсіі на гэны „клюб" у часе агульнага „націску" на гэную самую інтэлігенцыю выклікаў паважныя сумлівы адносна да новае арганізацыі. Цяпер мы даведаліся імёны засноўцаў-канцэсіянераў на гэны „клюб", якія гавораць красамоўна самі за сябе. Гэта ёсьць: пасол Антон Аўсянік, Язэп Мамонька (фабрыкант няіснуючае партыі беларускіх эсэраў — з благаслаўленьня „свыше"), Гассан Канапацкі (татарын) і.... пан Міхал Гурын, былы павадыр камуністычнае арганізацыі Заходняе Беларусі, а цяпер—сябра рэдакцыі „Беларускага Дня" і галоўны сьведка абвінаваньня ў працэсе Грамадаўскіх паслоў.

Малая, але запраўды-ж „дабраная" кумпанія!

Ізноў пагадзіліся! Нядаўна мы адзначылі, што сталы супрацоўнік „Biel. Krynicy" і „Сялянскае Нівы", „Сьветазар", зьяўляецца адначасна й дэфэнзыўна-абшарніцкім парабкам, друкуючы пад імем „Смрэчыньскі" ў „Słowie" свае стацьці-мэльдункі — з даносамі ўжо ня толькі на былых „грамадаўцаў", але й на сваіх беларускіх „хлебадаўцаў". Відаць, „хлебадаўцы"—кс. Станкевіч і Ярэміч—нечага паскупіліся на грошы... Цяпер, відаць, грошы для пана „супрацоўніка на два бакі" знайшліся, бо ён выступіў рашуча ў абароне ярэмічавага „Сельсаюзу" і проці групы „санатараў", якія працуюць над ачысткай гэнае арганізацыі ад усіх гэных палітычных спэкулянтаў, што „захапілі кіраўніцтва „Сельсаюзам" (Ярэмічам, Рагуляй, Більдзюкевічам). Мала таго: калі раней той пан „Смрэчыньскі" вінаваціў „Сельсаюз" у падладжываньні пад „Грамаду", дык цяпер ужо заяўляе, што праграма „Сельсаюзу" — „даволі памяркоўна сацыяльна"...

Але найбольш цікаўна й характэрна, што былы даношчык на „Сельсаюз", а цяпер ягоны гарачы абаронца, надрукаваў сваю стацьцю ў справе „Сельсаюзу" на страніцах органу „польскай дэмакратыі" — „Kur. Wil." (№ 195 з 28-га жніўня), хаця той орган пасьля рашучага выступленьня д-ра Я. Станкевіча і ягонае групы проці панаваўшае ў „Сельсаюзе" тройкі выявіў дужа няпрыхільныя адносіны да групы Ярэміча, Рагулі й Більдзюкевіча. Цяпер — пэўне-ж па загаду „зьверху" („Kur. Wil." выдае ўрадавая партыя—„Partja Pracy") — раптам сэрцу польскіх „дэмакратаў" сталі нязвычайна „любымі" і Ярэміч, і Рагуля, і Більдзюкевіч.... „Что сей сон значит"?

З жыцьця Горадні.

Арышты. У пачатку жніўня вайсковая дэфэнзыва арыштавала 4 жаўнераў з 81 п. п. па нацыянальнасьці беларусаў пад закідам процідзяржаўнай камуністычнай агітацыі, якую яны быццам вялі сярод жаўнераў. Арыштаваных, пратрымаўшы колькінаццаць дзён у гарнізонным арыштце, перавезьлі ў Вільню на Антокаль.

Галадоўка палітычных вязьняў. У суботу 19 жніўня ў Горадзенкім вастрозе выбухла галадоўка палітычных вязняў. Прычынай былі благія адносіны вострожнай адміністрацыі, якая пакарала адну з палітычных жанчын, садзячы ў кацэр. У знак пратэсту вязьні ў ліку 200 асоб зачалі крычаць: „прэч з белым тэрорам", „прэч з буржуазіяй" і г. д. Адначасна пачалі забарыкадоўваць ўваход у некаторыя камэры і гэтым самым утруднілі доступ адміністрацыі да іх. Выкрыкваньне гэтых лёзунгаў было чутно ўсяму гораду ў працягу двух дзён. Навокал вастрогу былі ўзмоцнены паліцэйскія пастарункі, а каб спыніць галадоўку, была запатрэбавана паравая пажарная машына з „Стражы Агнёвай", якая, прыбыўшы да вастрогу, была ўстаноўлена насупроць вокнаў і пушчана ў рух. Вада залівала ў камэрах пасьцелі. Цераз пару дзён пасьля гэтага галадоўка была спыняна. Народны.

Помач вёскі — месту. Бастуючыя Горадзенскія хімічныя работнікі выносяць сялянам-беларусам пралетарскае дзякуй за ахвяры ад ніжэйпаданых вёсак Лашанскае гм., Горадзенскага павету: в. Ліпаўні за 6 пудоў бульбы, хлеб, 30 фун. галоху, 17 яек, в. Баранава — 4 п. бульбы, 30 фун. гароху; 38 фун. збожжа і 1 зл. 30 гр. грашыма; в. Дарашкевічы — 38 яек і 7 зл. 10 гр.

Карэспандэнцыі.

Пара прачнуцца.

(Картуз-Бяроза, Пружаншчына).

Чытаючы „Нашу Праўду", часта-густа знаходзіш, што культурная праца, сярод нашых вёсак, расьце і шырыцца. Такому зьявішчу прыходзіцца толькі радавацца, ведаючы, што і мы, беларусы, даб'емся да лепшай долі, праз арганізацыю і нашу сьвядомасьць.

І вось, калі па ўсіх кутках нашай бацькаўшчыны Гурткі Т-ва Беларускае Школы, ня гледзячы на ніякія перашкоды, шпарка нясуць каганец асьветы ў самыя цёмныя куткі, Гурток Т-ва Б. Ш. у вёсцы Блудзень існуе толькі на паперы, бо ніякае культурнае працы ў галіне асьветы сялянства ня робіць і, як кажуць, зусім заснуў.

А даныя дзеля працы ёсьць. Блудзень—вялікая вёска, знаходзіцца каля станцыі чыгункі, заселена выключна беларускім жыхарствам, мае шмат моладзі і навет інтэлігенцыі, якая, мне здаецца, патрапіла-бы пры жаданьні вясьці працу ня горш, але навет лепш за іншыя вёскі. Але да гэтага часу моладзь в. Блудзень заўзята працавала і працуе толькі ў растаўрацыі, каля рознага гатунку і намеру чарак і шклянак. А напрацаваўшыся ходзяць па вуліцы, гэта ў лепшым выпадку, і сьпяваюць няпрыстойныя песьні. Стыдна, вам браты блудзенцы, стыдна! Пара апомніцца і дружна ўзяцца за працу, каб агульнымі сіламі змыць тую брудную пляму, якая ляжыць на вас. Дык жывей да працы! П. Кліновіч.

Спэктакль на вёсцы.

(Горадзенскі павет).

У вёсцы Плюскалаўцах, гм. В. Берастаўіцкае, Горадзенскага пав., драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларускае Школы пры дапамозе Акружной Управы, якая атрымала дазвол на пастаноўку п'ес для нашага Гуртка на дзень 21 і 28 жніўня,—дня 21 жніўня быў зладжаны вечар-спэктакль. Пастаўлены былі дзьве камэдыі: „Суд" Уладыслава Галубка і „Зьбянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча. Ня гледзячы на рабочую пару, глядзельнікаў было шмат—пераважна моладзі, якая вельмі прыхільна адносіцца да ўсякіх нашых пачынаньняў. Спадзяемся, што 28 жніўня глядзельнікаў будзе яшчэ болей. Увесь чысты даход ад спэктакляў — з першага пайшоў на выпіску кніжак для бібліатэкі-чытальні, якая існуе пры Гуртку, а ад другога будзе скіраваны на незаможных вучняў Віленскае Беларускае Гімназіі.

Выбары у Самаурады.

Далейшыя вынікі выбараў.

(Котранская гміна, Пружаншчына).

Як ужо было падана ў газэце, выбары ў нашай гміне прайшлі вельмі памысна з боку гледжаньня працоўнага сялянства. Аднак, далейшыя вынікі паказалі, што яшчэ барацьба ня скончана. Ворагі нашы пачалі з усіх сіл старацца, каб перарабіць выбары на свой капыл. Але, ня гледзячы на гэта, новаабраную раду зацьвярдзілі, а гэта вельмі „прыгнула хвасты" пашым „дабрадзеям" і іх надлізьнікам.

У вызначаны дзень новая рада прыступіла да выбараў войта, на якога аднагалосна выбралі грамадзяніна з вёскі Яноўцы, Мікалая Дульчэўскага, а на заступніка — з вёскі Пескі, Хвёдара Попка. Улада не зацьвярдзіла, закідаючы ім усім вядомыя грахі... што сьвядомыя беларусы. З гэтае прычыны рада была змушана паўторна выбраць войта і яго заступніка, пры чым сам гмінны інспэктар выстаўляў ад сябе аж дзесяць кандыдатаў. Аднак, рада амаль аднагалосна адкінула ўсе гэтыя кандыдатуры, пазываючыся на свае ўласныя права ў гэтай справе і выбрала на войта свайго сябра Мартына Талакняніка з вёскі Мокра, а заступніка з вёскі Красна Уладзімера Сахарэвіча. На гэты раз улада зацьвярдзіла войта, а яго заступніка ізноў не, назначыўшы, бяз ведама рады, заступнікам войта, асадніка з асады Чорныя Лозы, паручніка Антона Мальчэўскага. Гэтым „паны палажэньня" касуючы свае ўласныя законы аб выбарах, шкодзяць найгорш самі сабе, бо рада на гэта сваей згоды не давала і нат' да апошніх часоў ня ведала. Адначасна з гэтым у нашай гміне ідзе барацьба ўсёроўна як у Кітаі: з аднаго боку выступаюць прыхільнікі старой рады і войта і ўсе нашы „дабрадзеі", а з другога боку, усе сьвядомыя сяляне-беларусы з цьвёрдай верай у сваю перамогу. „Стары войт" да апошніх часоў ня верыў, што ня будзе ізноў панаваць над намі, бо за сем гадоў сваей службы купіў сабе маёнтак у дварэ Мокрэ, а каб яшчэ паслужыў, то купіў-бы па маёнтку сваім сыном, якія лятаюць за панамі на паляваньні, каб паслужыць у ролі „гончых" і дастаць чарку гарэлкі. Есьць яшчэ некалькі асобаў, якія іграюць з панам былым войтам у панскую дудку і ўсімі спосабамі стараюцца шкодзіць сялянскім інтарэсам. І гэтыя паны маюць яшчэ адвагу звацца вернымі сынамі нашай многапакутнай Бацькаўшчыны. Вы ня варты гэтага назову, бо вы сваімі паступкамі і злымі ўчынкамі выракліся яго, і здрадзілі свайму народу. Аднак, прыйшоў канец панаваньню войта і ў дзень здачы гміны да яго з усіх бакоў пайшлі з квіткамі сяляне па запрацаваныя грошы. Хаця грошы ад ураду ён атрымоўваў, сялянам плаціў за працу толькі квіткамі ды абяцанкамі. Варта пакрыўджаным сялянам зьвярнуцца ў гэтай справе да п. пракурора.

Цяпер сяляне вельмі абураны назначэньнем у заступнікі войта, асадніка Мальчэўскага, бо вядомая рэч, што яго могуць, пры цяперашніх абставінах, хутка перарабіць на войта (хаця не афіцыяльна, але фактычна...) адзіны ратунак у гэтай справе гэта, агульны пратэст ня толькі рады, якая павінна дамагацца сваіх правоў у вышэйшай улады, але і ўсяго грамадзянства. Побач з гэтым чакаем ад новае рады, каб яна ў першую чаргу дамагалася ў сваей гміне адчыненьня беларускіх школаў і дапамагала тым арганізацыям, акія працуюць у гэтай справе, бо ж сяляне яшчэ ў леташнім годзе злажылі дэклярацыі да школьнага інспэктара з дамаганьнем роднае беларускае школы, а адказу на гэта яшчэ няма. „Вораг Цемры".

Самаўрад Міжавіцкае воласьці Слонімскага павету.

Нарэшце 26 чэрвеня г. г. у нас адбыліся выбары валаснае рады. Праўда, гэтыя выбары прайшлі пры надта некарысных для нас варунках, якія стварыла ўлада, сфабрыкаваўшы свой падлізьніцкі камітэт для разьбіўкі воласьці на вокругі і для выбараў кандыдатаў валаснога сабраньня. Так: на Кракоцкі абвод, дзе люднасьць праваслаўная і больш сьвядомая вызначана 10 дэлегатаў, у той час, як на абвод Плаўскі з каталіцкай люднасьцю 25. Таксама вёска Сялявічы з каталіцкаю люднасьцю аказалася ў тры разы лепшай за тры ўзятыя разам вёскі Юхновічы, Мыслава і Варонічы. Перамагла толькі сьвядомасьць і арганізаванасьць нашага сялянства. Дзякуючы толькі ёй, удалося правясьці ў валасную раду 6 запраўдных прадстаўнікоў сялянства. Рэшта радных у ліку 6 таксама беларусы, але, як кажуць, служаць і нашым і вашым, а найбольш сваёй ўласнай асобе. Гэта ўсё прадстаўнікі на войта, як кажуць, людзі „porządne".

Праз пару тыдняў былі назначаны выбары войта. Дзякуючы той папулярнасьці, якую мае Паўла Таўлай, выбралі яго войтам. Чалавек гэта надта сумленны, разумны і ў дадатак адукаваны. З польскаю моваю таксама добра знаёмы і навет быў, праўда хутка зрэдукавалі, на польскай пасадзе. Ніхто і не падумаў, каб староста яго не зацьвердзіў. Але сталася інакш. На новыя выбары прыехаў і сам пан староста. Адчыняючы паседжаньне, ён зазначыў, што на войта трэба выбіраць „człowieka porządnego". Але, мусіць, са старастаю нашы сяляне ніколі ня сойдуцца ў паглядах, бо ў іх зусім інакшая ідэалёгія—ведама цемната—ім здаецца, што, калі чалавек сумленны, не прадае сялянскіх інтарэсаў за чарку гарэлкі, дык ён і „porządny", а ў старасты ідэалёгія зусім інакшая, адваротная. На гэтых выбарах ізноў мы атрымалі верх, выбралі на войта свайго чалавека. У соймік таксама паслалі сваіх людзей. Староста вельмі абурыўся за гэта і сказаў, што „porządnego człowieka" сам знойдзе, а рада няхай на кожным паседжаньні выбірае новага.

Нашы сяляне цяпер, пачухаўшы патыліцу, думаюць і разважаюць: ці патрэбна было пісаць законы, марнаваць час і паперу псаваць, калі ўсім верхаводзіць пан староста. І ці ня лепш было-б перайначыць і зваць не самаўрады, а старастаў рады, калі і далей будзе так вясьціся і калі й надалей старасты будуць накладаць на волю сялян сваю лапу. Біч.

Як адбыліся выбары ў гмінную раду.

(Каменская гміна, Горадзенскага павету).

Дня 2-га жніўня адбыліся ў нас выбары ў гмінную раду. Сяляне пашлі на выбары супольным фронтам па сьпіску № 2. На няшчасьце прыехаў нейкі пан з Варшавы асаднік Пшэдзельскі, каторы і разьбіў сялянскую еднасьць, бо шмат было сялян, каторыя яшчэ надта любяць цалаваць пана ў руку. Гэта зрабіла тое, што было выстаўлена аж 6 сьпіскаў. З першага і шостага прайшло па 2 радных, з нашага сьпіску № 2 прайшло 5 радных, а рэшта атрымалі па аднаму. Ня гледзячы на нашу большасьць, усё такі ўдалося панам-падлізам нагаварыць часьць сялян, абяцаючы ім чарку гарэлкі, а можа і па вазу дроў. Каб толькі галасавалі за імі. Надта дрэнна, што сярод нас сялян ёсьць такія асобы, што за прыгожыя словы паноў прадаюць свае інтарэсы і сваіх братоў сялян. Здаецца, пара прыйсьці да пераканаsucc ня, што лепшую будучыну будуем мы самы і што інтарэсы селяніна бліжэй да вяскоўца як да пана. Паны пушчаліся на ўсялякія хітрыкі, каб толькі як-кольвек пралезьці. Напрыклад, сяляне не хацелі, каб Язэп Гульмантовіч ізноў перайшоў у раду, дык ён кінуўся ў хітрыкі і даведаўшыся, што яго няма на сялянскім сьпіску, пачаў крычаць, што беларусы арганізуюцца, давайце і мы палякі арганізавацца, але гэта не памагло. Тады знайшоў ён новы спосаб махлярства, як лясьнік пачаў нагаварываць вёскі каля лесу, што, калі яго ня выбяруць, то ён ня дасьць лесу і дроў. І такім чынам удалося Гульмантовічу прайсьці ў раду.

Але рада яго няцешыць, бо будуць яшчэ выбары войта; на гэта-ж ён і прогся, каб з рады ды адразу на войта, але-ж ня так хутка вылячыцца як захварэў. Служыў ты 6 гадоў у радзе нічога добрага не зрабіў, а калі будзеш войтам, то таксама нічога ня зробіш. „Чуткі".

Да ведама.

(Скідальская гміна, Горадзенскага павету).

У дзень 28 га чэрвеня староста Горадзенскі распусьціў у сваім павеце ўсе Гмінныя рады, аднак аж да 9-га ліпня ніхто ў нашай гміне аб гэтым ня ведаў. Я сам даведаўся аб гэтым з польскае газэціны „Nasza Ziemia". Да гэтага часу ў нашай гміне гмінная рада і сам войт складаліся з такіх людзей, якія толькі ўмелі выпаўняць загады вышэйшай улады, а аб сваіх гмінных інтарэсах мала рупіліся. Шмат несправядлівасьці і шмат няпраўды выцярпеў народ, шмат было змарнована народнага дабра на нікаму непатрэбныя выдаткі. Народ было ўжо страціў надзею на папраўу свайго гаротнага жыцьця.

Аднак заблісла надзея ў вачох змучанага народу. Можа, хоць крыху, да можна паказаць будзе, што сяляне не авечкі, з якіх, ня пытаючыся стрыгуць шэрсьць і не скаціна, якая павінна толькі працаваць і ня ведаць, на што ідзе іх праца. Прыйшоў час калі і нашаму селяніну ёсьць можнасьць перадыхнуць. На цяперашнія выбары сяляне павінны ісьці больш разрахоўваючы. Не, ня час цяпер у такую цяжкую часіну для працоўнага народу выбіраць ізноў, падобных да старых, новых радных. Цяпер няма чаго ўглядацца на тое, што як гаспадар крыху багацейшы і праз гэта больш знаны ў гміне, то яго і павінны выбраць. Старыя радныя ўжо нам паказалі, што яны за людзі. Толькі выпаўнялі тое, што хоць і незаконна, загадае вышэйшая ўлада, кланяліся кожнаму кіўку панскага пальца і маўкліва спаўнялі ўсе ягоныя жаданьні, а потым выстаўлялі сябе сярод рэшты сялянства, як людзей паважных, разумных і ўмеючых абходзіцца з панамі абшарнікамі і шляхтаю.

Не, годзі гэтага, — гмінная рада гэта поле барацьбы за інтарэсы працоўнага селяніна. Трэба, каб у новай радзе замест таго, каб моўчкі згаджацца з кожным панскім жаданьнем раздаўся голас пратэсту ў абароне нашых сялянскіх правоў, каб замест абараняць абшарніцкія інтарэсы, яна падала свой голас у абарону таго, хто працуе на ўсіх, а сам нічога ня мае.

Хто ня чуе сябе да гэтага дужым, хай уступіць дарогу другому. Браты сяляне, вы павінны прыслухоўвацца да голасу тых людзей, што йшлі заўсёды наперад, абараняючы і выкрываючы ўсе несправядлівасьці, датычачыя нас беларусаў. Толькі слухаючы іх, вы споўніце свой абавязак перад намі і беларускім народам. „Мазоль".

У грам. Язэпа Гульні з в. Скоржыкаў Каменскае гміны, Горадзенскага павету

укралі партфэль

з вайсковымі дакумэнтамі, выданымі праз П. К. У. у Горадні.

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАЎШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДАМ.

Рэдактар-Выдавец: П. Кушняк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.